УДК 808.26–313.1(043.3)

**В. Р. Слівец**
Аспірант кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна"

# ГРУНТОЎНА ПРА БЕЛАРУСКУЮ АНАМАСТЫКУ

*"Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія : дапаможнік для магістрантаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 80 11 "Мовазнаўства". – Мазыр : Выснова, 2018. – 355 с.*

Вядомы лінгвіст, доктар філалагічных навук, прафесар В. В. Шур амаль 50 гадоў сваёй навуковай і працоўнай дзейнасці прысвяціў даследаванню анамастычных адзінак у соцыуме і ў творах мастацкай літаратуры. Значнае месца ў шырокім коле яго навуковых інтарэсаў займаюць актуальныя ў наш час лінгвістычнае краязнаўства і літаратурная анамастыка. Даследаванню анамастычнай лексікі беларускай мовы, асаблівасцям функцыянавання гэтых моўных адзінак у грамадстве і ў тэкстах мастацкіх твораў беларускіх пісьменнікаў прысвечаны яго манаграфіі "З гісторыі ўласных імёнаў" (Мінск, 1993), "Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка" (Мінск, 1998), "Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры" (Мінск, 2002), "Онім у мастацкім тэксце" (Мінск, 2006), "Уласныя імёны ў часе і прасторы" (Мінск, 2008), "Уласныя імёны ў мастацкім тэксце" (Мазыр, 2010), "Слова ў мастацкім кантэксце" (Мазыр, 2013. – у суаўтарстве), "Уласнае імя ў соцыуме і ў мастацкім тэксце" (Мінск, 2015). Ён таксама аўтар і суаўтар шэрагу вучэбных дапаможнікаў для школ і ВНУ. У 2018 годзе апублікавана яго чарговая кніга – ***"Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія".***

Яна складаецца з трох раздзелаў, назвы якіх гавораць самі за сябе: *"Ля вытокаў нашых імёнаў", "З гісторыі беларускіх прозвішчаў", "З гісторыі беларускіх тапонімаў".* У першым раздзеле апавядаецца пра гісторыю ўласных імёнаў, пачынаючы з часоў язычніцтва і да нашых дзён. Тэарэтычны матэрыял багата ілюстраваны прыкладамі, якія падкрэсліваюць унікальнасць і самабытнасць беларускага нацыянальнага іменніка, і падмацаваны статыстычнымі дадзенымі, якія адлюстроўваюць характар і частотнасць ужывання ўласных імёнаў на пэўным гістарычным адрэзку часу ці ў канкрэтнай мясцовасці. Аўтар засяроджвае ўвагу на існаванні варыятнасці ва ўжыванні ўласных імёнаў у розных рэгіёнах Беларусі, што стала вынікам узаемадзеяння рэлігійных ідэалогій (каталіцкай, праваслаўнай, язычніцкай), фанетычнай і марфалагічнай трансфармацыі разнастайных паводле паходжання імёнаў (скіфскія, грэчаскія, рымскія, скандынаўскія), уплывам грамадска-палітычных фактараў і інш.

Другі раздзел прысвечаны аналізу вытокаў, паходжання, працэсу фарміравання нашых нацыянальна адметных прозвішчаў, спосабаў і мадэляў утварэння, іх лексічнага складу, межаў бытавання, асаблівасцей ўзаемаўплыву беларускіх і замежных прозвішчаў. Грунтоўна разгледжана і сістэма мянушак у айчынным анамастыконе, ад якіх утворана вялікая колькасць сучасных прозвішчаў.

Значнае месца адводзіцца разгляду адметнасцей функцыянавання ўласных назваў (імёнаў, прозвішчаў, мянушак) у літаратуры на прыкладах з твораў выдатных майстроў беларускага мастацкага слова (В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Колас, І. Мележ, І. Навуменка). З шэрагу онімаў літаратурных персанажаў асобна аўтар вылучае гаваркія імёны, якія адрозніваюцца асаблівай характарыстычнасцю і экспрэсіўнасцю. Як іх разнавіднасць аналізуюцца і сістэматызуюцца мянушкі ў кантэксце вывучэння творчай спадчыны Я. Коласа. Не абыходзіць увагаю аўтар гісторыю ўтварэння і паходжання псеўданімаў, раскрываючы некаторыя "таямніцы" іх узнікнення.

У трэцім раздзеле манаграфіі даследуюцца ўтварэнне, этымалогія і функцыянальнае ўжыванне тапонімаў на розных гістарычных этапах, змены ў беларускай тапанімічнай сістэме і вынікі гэтых пераўтварэнняў. Неабходна падкрэсліць грунтоўны падыход аўтара ў падачы гіпотэз паходжання некаторых айконімаў. Разглядаюцца адразу некалькі этымалагічных версій, прыводзяцца народныя тлумачэнні (легенды, паданні), меркаванні аўтарытэтных навукоўцаў і свае ўласныя погляды (айконімы *Масква*, *Мазыр*, *Гомель*, *Магілёў*, *Мінск* і інш.). Засяроджваецца ўвага на ўзаемадзеянні беларускай анамастычнай сістэмы з лексікай іншых этнасаў (мазуры, яцвягі, балты, прусы, татары і інш.), што таксама адлюстравалася ў тапаніміцы. Аналіз тапанімічных назваў дае ўяўленне аб працэсе засялення тэрыторыі сучаснай Беларусі, прыродна-геаграфічных умовах існавання, сацыяльна-эканамічных стасунках з іншымі народамі. Пра многае "распавядаюць" тыпы пасяленняў (вёскі, хутары, пасёлкі, фальваркі, мястэчкі, засценкі, слабоды, аколіцы, двары) і іх назвы.

Вучэбны дапаможнік адрасаваны магістрантам. Аднак навукова-папулярны характар гэтай кнігі, удалае спалучэнне дакладных энцыклапедычных звестак з цікавымі, займальнымі фактамі значна пашырае кола яе чытачоў. Нельга не адзначыць і вялікі выхаваўчы патэнцыял дапаможніка, які, безумоўна, будзе карысны ўсім тым, хто не толькі цікавіцца беларускай анамастыкай, але і імкнецца пашырыць свае веды ў галіне гісторыі, культуры Беларусі, хто неабыякавы да сваёй малой радзімы, і заклапочаны захаваннем нацыянальных традыцый і культурных набыткаў, як і аўтар гэтай кнігі. Сімвалічна, што дапаможнік выйшаў менавіта ў 2018 годзе, які аб'яўлены ўрадам Рэспублікі Беларусь Годам малой радзімы.

МГПУ им. И.П.Шамякина